

Газета заснавана ў 1938 годзе. Адноўлена ў 1997 годзе.

МАСАВА-ПАЛІТЫЧНЫ ШТОТЫДНЁВІК

Газета Слонімская

№2 (344) 8 — 14 студзеня 2004 г. Наклад 11.150 экз. Кошт у розніцу свабодны

«ГАЗЕТУ СЛОНІМСКУЮ» ЧЫТАЮЦЬ Слонім, Зэльва, Дзятлава, Масты, Ваўкавыск, Шчучын, Ліда, Гродна, Баранавічы, іншыя гарады Беларусі, а таксама на HTTP://gs.promedia.by

СВЯТА

КАЛЯДНАЯ СУСТРЭЧА

У Слонімскім Доме афіцэраў прайшла цікавая Калядная сустрэча з дзецьмі і дарослымі, якую наладзіў раённы аддзел грамадскага аб'яднання "Саюз палякаў на Беларусі" пад кіраўніцтвам Леанарды Рэўкоўскай.

Падчас сустрэчы каля навагодняй ёлкі гучалі калядныя песні і вершы. Выступалі хор "Крэда" і танцавальны калектыў "Бліскавічка". У канцы свята Дзед Мароз уручыў дзеткам калядныя падарункі.

Сяргей ЧЫГРЫН

КУРСЫ ОБМЕНА ВАЛЮТ ПО СОСТОЯНИЮ НА 08.01.2004 ГОДА

"Беларусбанк"	Покупка	Продажа
1 USD	2140	2180
1 EURO	2620	2800
1 ZL	525	580
1 RUR	69	73,50

"Белстройбанк"	Покупка	Продажа
1 USD	2130	2170
1 EURO	2620	2730
1 ZL	530	580
1 RUR	71	73,7

"Белагропромбанк"	Покупка	Продажа
1 USD	2115	2170
1 EURO	2610	2700
1 ZL	530	590
1 LAT	3930	4030
1 LIT	690	790
1 UAN	350	410
1 GBP	3730	3830
1 RUR	69	74

СНЕГ: КАМУ Ў РАДАСЦЬ, А КАМУ Ў ЦЯЖКАСЦЬ



Фота Тацяны ПЛАХЕТКА

■ Калядныя канікулы ўдаліся

Здавалася, што Новы год і Каляды слонімцы будуць святкаваць пад даждждом, але неўзабаве за некалькі гадзін да наступлення свята пайшоў белы пушысты снег...

Асабліва ўзрадаваліся гэтым абставінам дзеці, і ўжо 1 студзеня, калі дарослыя "адыходзілі" пасля святочнай ночы, яны, узяўшы саначкі, пайшлі катацца з усіх горак, якія маглі знайсці ў горадзе.

Нават невялічкую горачку на вуліцы Першамайскай, дзе па традыцыі праходзяць розныя ўрачыстыя мітынгі і дэманстрацыі, раскаталі.

Тацццяна ПЛАХЕТКА

(Працяг тэмы на 2 стар.)

ГОРОД

ИСТОРИЯ О ТОМ, КАК СЛОНИМЧАНЕ СПАСАЛИ ЛЕДЯНУЮ ГОРКУ

■ Янина МЕЛЬНИКОВА

"Да что же это такое! Мы совсем устарели душой! Для стариков у нас — все! А для детей?" — с такими словами в редакцию "ГС" ворвалась возбужденная женщина. Зовут её Валентина Тимохина. Она рассказала, что уже который год вместе с мужем Владимиром отстаивает право детей на ледяную горку во дворе.

Семья Тимохиных живет в доме №1 на улице Клары Давыдюк с 1972 года, получается, уже 32 года. Выросли дети, подрастает внук. На памяти жителей этого дома детская площадка была здесь лет десять назад. Со временем качели пришли в негодность, песочница развалилась, а дети, живущие в самом центре города, слоняются по улице, не зная, чем заняться.

Однажды зимой Владимир Тимохин набрал ведро воды и стал заливать ледяную горку у себя во дворе. Потом пошел домой за вторым ведром, за третьим... Так мужчина вылил на снег около пятидесяти ведер воды.



Фота Таццяны ПЛАХЕТКА

■ Ледяную горку в одном из дворов на улице К. Давыдюк спасали всем миром

Образовалась ледяная корка, и детишкам кататься понравилось. И не только им одним: некоторые взрослые из соседних домов тоже не прочь прокатиться раз-другой с горки, вспомнить детство. Да вот только не бывает так, чтобы все вокруг были довольны и счастливы. Это в семье Тимохиных знают по опыту прошлых лет. Наступивший 2004 год исключением не стал.

После выходных и праздничных дней во дворе появился мастер ЖЭСа №1 и приказал дворнику засыпать ледяную горку песком. Мол, мешает людям ходить, могут быть переломы и ушибы. И действительно, по двум сторонам горки находятся лестницы. Правда, лестницей это трудно назвать: ступеньки узенькие, с выбоинами, да и продолжаются только до середины спуска, дальше — спускайтесь как знаете. Но главное ведь не то, как по ней ходят люди, главное — наличие этой самой лестницы.

А лестница есть, ее ступеньки дворники аккуратно вычистили, посыпали песком, сделали песчаную дорожку вниз, чтобы людям было удобнее ходить. Но вот каким образом горка может мешать людям, идущим по ступенькам, дворникам тоже не понятно. Зато всем ясно, что горка для детей нужна.

К счастью, как выяснила корреспондент "ГС", важность и нужность ледяной горки понял начальник ЖЭСа №1 Сергей Борбутько. После обращения к нему четы Тимохиных Сергей Митрофанович принял решение горку оставить и песком не засыпать.

Дети рады такому решению взрослых, потому что, как известно, зима в наших широтах становится все мягче и мягче, а значит, ледяная горка очень скоро потечет ручьями, оставив после себя только лужицу воспоминаний. И нужно непременно успеть вдоволь накататься.

Детишки с энтузиазмом взялись за метлы дворников и почистили свою горку от уже насыпанного на нее песка. А их родители мечтают о том времени, когда досугом их детей займутся ответственные за это люди. Ведь было время, когда городские власти заботились о том, чтобы зимой были горки и катки для детей, как это делают в других городах. ■

НА МОВЕ ЛІЧБАЎ

БЮДЖЭТ СЛОНІМСКІЯ ДЭПУТАТЫ ПРЫНЯЛІ

■ Сяргей ЧЫГРЫН

Напрыканцы мінулага года адбылася сесія Слонімскага раённага Савета дэпутатаў. На сесіі разглядалася шэраг пытанняў, але асноўнымі з'яўляліся два — аб бюджэце Слонімскага раёна на 2004 год і выкананні яго за 2003 год, а таксама аб прагнозе сацыяльна-эканамічнага развіцця раёна на 2004 год.

Сесія Слонімскага райсавета зацвердзіла раённы бюджэт на 2004 па даходах і расходах у суме 35 176 019 тысяч рублёў. Вядома, сума гэта немалая. Але ці хопіць яе, каб насельніцтва нашага раёна жыло па-людску, а не выжывала? Ды і гэты бюджэт не параўнаць з бюджэтам любога еўрапейскага горада, падобнага на Слонім, дзе фінансаванне намнога больш, чым у нас.

Тым не менш бюджэт горада зацверджаны і па ім будзем жыць.

Напрыклад, на адукацыю ў гэтым годзе павінна быць расходавана больш за 16 мільярдаў рублёў, а вось на медыцыну менш — 10 мільярдаў 183 мільёны рублёў.

Больш за ўсё ў гэтым плане пашанцавала праваахоўным органам. На іх дзейнасць толькі з мясцовага бюджэту будзе выдаткавана 120 млн. рублёў, гэта ў 2,2 раза больш, чым летась. Будуць павялічаны расходы і на футбольны клуб "Камунальнік" — са 175 мільёнаў летась да 280 мільёнаў сёлета. Вось такія грошы з раённага бюджэту пойдуць на ўтрыманне клуба, а гульні добрай як не было, так і няма.

На культуру ў 2004 годзе фінансаванне зменшылася і складзе каля 984 млн. рублёў (у мінулым годзе фінансаванне складала больш за адзін мільярд рублёў). Прыйдзецца работнікам слонімскіх культасветустаноў самім зарабляць грошы, бо заробкі ў іх па-ранейшаму будуць самымі нізкімі.

Каля 2 тысяч даляраў з бюджэту раёна трэба будзе сёлета выдаткаваць на ўтрыманне РК БПСМ. І з якой гэта нагоды мясцовыя патрыёты заслужылі такую ласку? А не лепш было б гэтыя грошы закласці ў бюджэт для Слонімскага таварыства беларускай мовы ці на дапамогу творчай інтэлігенцыі — мастакам, літаратарам, кампазітарам, музыкантам? Бо яны сапраўды шмат карыснага робяць для свайго роднага горада: арганізоўваюць розныя цікавыя вечарыны, канцэрты, выставы, конкурсы, вандроўкі. І ўсё гэта робіцца бясплатна.

Зменшаны сёлета выдаткі на падтрымку сельскай гаспадаркі, яны складаюць 223 млн. 120 тысяч рублёў, на кіно — да 32 млн. руб., на бытавое абслугоўванне насельніцтва — да 10 млн. руб.

Гэта пра расходы. А цяпер пра даходы. За кошт чаго найперш сёлета плануецца папаўняць наш раённы бюджэт, тым больш што некаторыя прадпрыемствы амаль не працуюць ці працуюць з перабоямі? З бюджэту Слонімскага раёна на 2004 год бачна, што ён будзе папаўняцца з розных крыніц, а таксама за кошт падатку з грамадзян, які павялічыцца ў 1,5 раза і за кошт даходаў ад прадпрымальнікаў. Але ці стане прадпрымальнікаў у горадзе больш, ці проста павялічыцца падатак з тых, хто сёння займаецца індывідуальным прадпрымальніцтвам? Найхутчэй узрасце падатак, таму прадпрымальнікаў па-ранейшаму будуць абдзіраць як ліпку. Папаўняцца бюджэт будзе і за кошт павелічэння платы за дзяржрэгістрацыю суб'ектаў гаспадарання і за выдачу ліцэнзій. У 1,9 раза ў параўнанні з мінулым годам павялічыцца бюджэт за кошт збораў за паслугі гасцініц, рэстаранаў, кафэ і г. д.

Адным словам, мусіць, жыць ў гэтым годзе мы не станем лепш. Цэны на ўсё вырастуць, а заробак і пенсія ад росту цэн будуць значна адставаць. ■

НАВІНЫ

У МЕДЫКАЎ — НАВАСЕЛЛІ

Перад самым Новым годам некалькі аддзяленняў Слонімскага тэрытарыяльнага медаб'яднання, якія месціліся ў памяшканні кляштара бернардзінак у цэнтры горада, памянялі свае адрасы.

Як паведаміў карэспандэнту "ГС" галоўны ўрач Слонімскага ТМА Юрый Пяцельскі, афтальмалагічнае аддзяленне пераехала на Камсамольскую вуліцу ў памяшканне былога скурна-венералагічнага дыспансера. У сваю чаргу гэты дыспансер цяпер месціцца ў інфекцыйным аддзяленні, а лорааддзяленне знаходзіцца ў хірургічным аддзяленні бальніцы. У памяшканні побач з афтальмалагічным аддзяленнем будзе размяшчацца дзённы стацыянар ТМА.

Дзіцячую паліклініку, магчыма, перавядуць у прафілакторый КПФ "Сонечны", а ў самой паліклініцы пачнецца капітальны рамонт.

Сяргей ЧЫГРЫН

ПЕРШЫ "ВЯТРАК" У 2004 ГОДЗЕ

Выйшаў з друку першы сёлетні нумар бюлетэня слонімскага творчага аб'яднання "Вятрак". Рэдагуе гэтае выданне Алег Шэлестаў.

Бюлетэнь разнастайны па змесце сваіх публікацый. Аўтары цікава распавядаюць пра Маладзёжны цэнтр ЮНІСЭФ, пра грамадства і экалогію, пра жыццё і дзейнасць беларускага мастака і пісьменніка Напалеона Орды. Юныя чытачы з захапленнем прачытаюць матэрыялы, прысвечаныя школьнаму жыццю, дзявочай прыгажосці і каханню.

У бюлетэні друкуюцца таксама літаратурныя творы, анекдоты і гістарычны конкурс.

Сяргей ЧЫГРЫН

СУДОВАЯ СТАТЫСТЫКА

СУДЗІЦЬ НЯЛЁГКА

У 2003 годзе суддзі Слонімскага раённага суда разгледзелі і завяршылі 388 крымінальных, 2 337 адміністрацыйных і 1 379 грамадзянскіх спраў.

Мінулы год для служыцеляў мясцовай феміды быў цяжкім у тым плане, што працаваць кожнаму суддзі прыходзілася за дваіх. У 2003 годзе на працягу васьмі месяцаў заставаліся вакантнымі дзве пасады суддзі. Разам са старшынёй суда працавалі чатыры суддзі. А калі адзін з іх ішоў у адпачынак, то правасуддзе на Слонімшчыне вяршылі фактычна тры чалавекі. Такім жа складам слонімскія суддзі пачалі і 2004 год.

Мікола КАНАНОВІЧ

Наш Web-адрес: http://gs.promedia.by

ДЗЕЙНІЧАЕ
грамадская праваабарончая прыёмная
Звяртацца па чацвяргах з 18.00 да 22.00 па тэл. 2-42-78.

КОНТРОЛЬ

ПРОВЕРИЛИ КРАСНЫЙ КРЕСТ

■ Янина МЕЛЬНИКОВА

Еще десятилетие назад гуманитарная помощь, приходившая к нам из-за границы, вызывала в душе двоякие чувства. С одной стороны, ношеные вещи с плеча какого-нибудь бюргера оскорбляли наши чувства, унижали наше достоинство. С другой — показывали нам пример милосердия и напоминали о том, как всем миром в далекие советские времена мы собирали посылки для африканских и вьетнамских детишек.

К СВЕДЕНИЮ

Символ Международного комитета Красного Креста представляет собой красный крест на белом фоне — цвета швейцарского флага в обратном порядке. В мусульманских странах было одобрено создание аналогичной организации, но под названием "Красный полумесяц". В странах бывшего СССР эмблема представляла собой крест и полумесяц рядом друг с другом.

Идея международной помощи жертвам войны и стихийных бедствий принадлежит Анри Дюнану, швейцарскому бизнесмену и гуманисту. Международный Красный Крест был основан в 1863 году. Национальные общества Красного Креста и Красного полумесяца существуют в настоящее время в 149 странах мира, объединяя в своих рядах 250 миллионов человек. Белорусское общество Красного Креста создано в 2000-м году. Это добровольное республиканское общественное объединение, созданное в целях решения социальных проблем, облегчения человеческих страданий

Сегодня отношение к гуманитарной помощи с Запада однозначное: "гуманитарке" быть! Потому что для многих она единственное спасение, возможность хоть как-то одеть своих детей и себя. Правда, если для одних жителей Слонима гуманитарная помощь — бесспорно доброе дело, для других — это головная боль.

Красный Крест работает в Беларуси не один десяток лет, и в Слониме о его деятельности знают многие. Придя в помещение Красного Креста на улице Доватора, люди могут получить необходимую медицинскую помощь (тут сделают внутримышечные и внутривенные инъекции, измеряют давление, температуру), им помогут подобрать одежду и обувь из гуманитарной помощи, выслушают проблемы, посоветуют, куда с ними обратиться.

В школах часто объявляют акции по сбору бывших в употреблении вещей, на предприятиях не один год подряд собирают пожертвования.

Головная боль пришла, как всегда, когда ее никто не ждал. Проверка Комитета госконтроля по Гродненской области внезапно приехала и в наш город. Причиной проверки стало несоблюдение требований законодательства, регулирующего порядок оплаты труда, учета, распределения и использования гуманитарной помощи в Гродненской областной организации Белорусского общества Красного Креста. Было принято решение выборочно проверить деятельность и нескольких районных отделений этой организации, среди которых оказалась и слонимская.

По словам ее руководителя Ольги Георгиевны Гавловской, проверкой госконтроля действительно был обнаружен ряд нарушений в ведении учета выдачи гуманитарной помощи. Причиной стал учет в специальной пронумерованной и прошнурованной книге, в которую вносятся данные о получателе гуманитарной помощи, в частности фамилия, имя, адрес получателя, его паспортные данные. А необходимо было вести учет по ведомостям, полученным, по словам Ольги Гавловской, слонимской организацией уже после проверки. В сущности, ведомости ничем от книги не отличаются, но если бумага должна быть единого образца, значит, она должна быть именно такой. Это закон такой, с ним не поспоришь. Об удобстве сохранения таких разрозненных "бумажек" никто, видимо, не думал. А ведь хранить единую книгу выдачи куда легче и проще.

Также в вину работникам Слонимской организации Красного Креста ставится передача двух модифицированных медицинских наборов мясокомбинату и "Белтрансгазу". Модифицированные наборы, в состав которых входили бинты, шприцы, йод и другие медикаменты, действительно были переданы не самым бедным слонимским предприятиям. Но, по словам Ольги Гавловской, такие же наборы были переданы Красным Крестом больнице, детской поликлинике и другим организациям. А тот факт, что наборы были переданы в том числе и этим двум предприятиям, лишь подтверждает безграничную благодарность работников общественной организации: и мясокомбинат, и "Белтрансгаз" неоднократно перечисляли на счет Красного Креста немалые суммы денег, часть которых шла на оплату труда работников Красного Креста. Мало кто знает, но, несмотря на международный характер организации, заработная плата каждой из структур Красного Креста зависит от собранных пожертвований.

Гуманитарная же помощь, которую распределяли без ведома отдела социальной защиты, поступает в Красный Крест крайне нерегулярно. И чаще всего состоит она из вещевой помощи предприятий и организаций нашего города. Так, в декабре, к новогодним праздникам, индивидуальный предприниматель Роман Гиль выделил свою продукцию: 23 взрослые и 10 детских кофточек. Но для того, чтобы раздать их людям, необходимо собрать много разных справок, доказать, что ты имеешь право на эту помощь. А еще необходимо согласовать списки нуждающихся в госучреждении, в частности в отделе социальной защиты.

Практика, мягко говоря, странная: общественная организация, осуществляющая свою деятельность по линии международного Красного Креста, не может оказать помощь нуждающимся без согласования с соцзащитой. Вот и выходит, что помощь должны получать строго зафиксированные граждане? И при этом ребенок-инвалид или ребенок из малообеспеченной семьи станет таковым только после того, как на список Красного Креста поставят печать. А до того он к ним относиться права не имеет?

Комитетом госконтроля были выявлены и другие нарушения: выдача медицинских принадлежностей без справки от лечащих врачей. Это нарушение также выглядит весьма неоднозначно: что плохого в том, что работники Красного Креста выдают нуждающимся бинты и шприцы? Кому бы они ни предназначались, больным или наркоманам, все равно использованы они будут только во благо человека. В Светлогорске, к примеру, давно существуют специализированные пункты обмена и выдачи разовых шприцев. Это считается благородным занятием — внести свою лепту в дело нераспространения ВИЧ-инфекции.

Материалы проверки Слонимской районной организации Красного Креста были переданы правоохранительным органам, и те, вероятно, вынесут соответствующее решение: распределение гуманитарной помощи с нарушениями — проступок весьма серьезный. Причиной такого отношения, скорее всего, является давно сложившийся в нашем обществе стереотип: тот, кто имеет дело с "гуманитаркой", живет припеваючи. Вот только ни Ольга Георгиевна Гавловская, ни медсестры, работающие в Красном Кресте, о такой райской жизни даже не мечтают. Желание у них одно: Красный Крест в Слониме должен жить и приносить облегчение тем, кто в нем нуждается. ■

ТРАГЕДЫЯ

ЮНАК СТАЎ АХВЯРАЙ ВАДЫ

17-гадовы навучэнец Слонімскага сельскагаспадарчага каледжа Аляксей Шпетны, на якога міліцыя аб'явіла вышук за тыдзень да новага года, дамоў так і не вярнуўся.

Юнак сышоў з дому 5 снежня і не падаваў пра сябе ніякіх звестак. 26 снежня мясцовыя падлеткі, якія гулялі на беразе возера ў мікраранёне Энка, знайшлі ўмерзлы ў лёд труп маладога чалавека. Як потым аказалася, гэта і быў зніклы Аляксей Шпетны. Прыкметаў гвалтоўнай смерці праваахоўнікі не выявілі. Пры пацярпелым знайшлі пашпарт на яго імя і грошы.

Усе акалічнасці трагедыі даюць падставы меркаваць, што Аляксей Шпетны стаў яшчэ адной ахвярай вады мінулага года.

ПАМЕРЛА АД ЗАПАЛЕННЯ ЛЁГКІХ

Пяцікласніца Партызанаўскай базавай школы Марына Астапава памерла ад запалення лёгкіх.

Раніцай 2-га студзеня работніца мясцовага ФАПа выклікала адразу "хуткую дапамогу" і міліцыю. Дзяўчынка ўжо была мёртвай.

Анатаміраванне паказала, што ад высокай тэмпературы ў 11-гадовай Марыны "згарэлі" лёгкія.

Хутчэй за ўсё гэта здарылася па той прычыне, што, калі дзяўчынка захварэла, своечасова ніхто не звярнуўся па медыцынскую дапамогу. Бацька Марыны ў гэты час знаходзіўся на заробках у Расіі. Пахавалі дзяўчынку напярэдадні Калядаў, 6 студзеня, калі дамоў вярнуўся бацька. У сям'і Астапавых засталіся двое малодшых дзяцей.

Мікола КАНАНОВІЧ

ВЫТВОРЧАСЦЬ

СЛОНІМСКІЯ ВІНАРОБЫ ПАВЯЛІЧВАЮЦЬ АСАРТЫМЕНТ

■ Мікола КАНАНОВІЧ

У 2003 годзе Слонімскі вінзавод выпусціў 736 далаў пладова-ягадных вінаў. У параўнанні з 2002 годам тэмп росту вытворчасці на прадпрыемстве ў суадносных цэнах склаў 112,7 працэнта. У планах прадпрыемства на 2004 год — не зніжаць тэмпаў вытворчасці.

Вінзавод знаходзіцца ў ліку нямногіх гарадскіх прадпрыемстваў, якія стабільна і паспяхова працуюць апошнія гады. Людзі менш піць не сталі, а вось выбар тых жа пладова-ягадных вінаў значна пабольшаў. Слонімскае віно знаходзіць свайго спажыўца, найперш дзякуючы адносна невялікаму кошту і добрай якасці.

Мінулы год якраз і быў знамянальны для прадпрыемства тым, што завод атрымаў міжнародны сертыфікат стандарта якасці. Асобныя гатункі (найперш салодкага віна) заваёўвалі медалі на розных міжнародных конкурсах.

Спецыялісты прадпрыемства не толькі працуюць над паляпшэннем якасці сваёй прадукцыі, але таксама імкнуцца разнастаць асартымент, распрацоўваюць новыя гатункі віна.

Па словах галоўнага тэхнолага завода Святланы Лук'янавай, у мінулым годзе яны выпусцілі чатыры новыя найменні пладова-ягаднага віна — "У сваты", "Майская ноч", "Вермут залацісты" і "Галіна рабіны".

Святлана Віктараўна зазначыла, што 70% сыравіны, якая выкарыстоўваецца на заводзе для вырабу віна, — гэта яблыкі. Здавалася б, пры такім раскладзе не вельмі і паэксперыментуеш з асартыментам, аднак і ў годзе, які надышоў, мясцовыя вінаробы працягваюць распрацоўваць новыя гатункі віна.

Як адзначыла галоўны тэхнолаг, сёлета павінны з'явіцца ў продажы "Яблычна-алычовае", "Слонімскае юбілейнае", "Дары саду" і яшчэ чатыры найменні віна, якія пакуль не маюць назвы.

Тым не менш канкураваць на рынку віна слонімскім вінаробам не так проста, калі нават такі гігант па вырабе алкагольнай прадукцыі, як "Мінск Крышталь", пачаў выпускаць пладовае віно. Але апошняе слова, як вядома, заўсёды за пакупніком. Яму выбіраць: піць "Вермут залацісты" вытворчасці Слонімскага вінзавода, мінскае віно "Вермут Крышталь" ці нешта іншае. Галоўнае, каб віно на нашых сталах сапраўды было нам у радасць і было яго з чаго выбіраць. ■

СОЦИУМ

ЖЕЛАЕМ ЗНАТЬ, ЧТО БУДЕТ

■ Янина МЕЛЬНИКОВА

Так устроены люди: хлебом их не корми, дай узнать, что ждет в будущем. Особенно в такой важный период, как Новый год и Рождество. В это время даже самые верующие люди, которые с детства знают о вреде гадания, не могут удержаться и с любопытством кладут под подушку записочки или ждут первого переступившего порог гостя.



■ Современные гадалки и маги пользуются популярностью

БАБУШКИНЫ СКАЗКИ

Издавна в деревнях люди знали десятки разных способов узнать, что ждет человека в наступившем году, что нового принесет он для семьи. Девушки собирались в сочельник в доме, зажигали свечи, расставляли зеркала, бросали за порог туфельку. Современный мир давно перерос эти бабушкины приметы. Сегодня желающие узнать свою судьбу обращаются в элитные астрологические салоны, к магам и гадалкам высшей категории.

Но кое-кто в деревнях до сих пор верит в старые приметы и жжет в новогоднюю ночь смятый листок бумаги с написанным на нем желанием, а потом по рассыпанному пеплу трактует, что ждет его в следующем году. Или капает расплавленным воском на воду, пытаясь разглядеть будущее.

ГАДАНИЕ ПО МОБИЛЬНОМУ ТЕЛЕФОНУ

Счастливые обладатели мобильных телефонов не расстаются со своими верными друзьями даже в новогоднюю ночь. Оттого у современных подростков очень популярно гадание по "мобильнику". Все очень просто: нужно записать все номера всех телефонов людей, звонивших вам в эту ночь (коды городов и операторов связи при этом не учитываются). Например, на Новый год вас поздравили три человека с номерами 795-25-12, 662-44-15 и 756-81-13. Необходимо сложить все цифры мобильных телефонов звонивших до однозначного числа, в данном случае получаем 4+1+4=9. Полученная цифра нечетная, а поскольку наступивший 2004 год четный, то такое разногласие не сулит ничего особенно хорошего. А вот если сумма цифр будет четной, тогда год обещает быть успешным и удачным во всем.

ГАДАНИЕ ПО-СЛОНИМСКИ

Большинству слонимчан, конечно, такие изыски не доступны. Но и они, при желании, могут заглянуть за завесу завтрашнего дня. Слонимчанам достаточно просто отправиться на городской рынок. Как это сделала учащаяся медучилища Наташа К. вместе с подругами. Юная слонимчанка решила прогуляться по рынку, присмотреть кое-какие подарки родным.

Но прогулка по рынку, начинавшаяся так беззаботно и весело, закончилась слезами: по дороге, возле синагоги, девушки встретили женщину в длинной юбке и платке. Улыбающаяся всеми тридцатью тремя зубами, цыганка тут же схватила Наташку за руку и уже не отпустила: "Красавица, хочешь, погадаю? Всю правду скажу! Что было, что будет. Ждет тебя дорога длинная и счастливая!"...

Что было дальше, Наташа толком не помнит. Вроде бы говорила цыганка про то, что встретит она скоро судьбу свою, что счастливее ее не будет на свете, что ждет ее путешествие к морю... В общем, стандартный набор обещаний на долгую счастливую жизнь.

А когда Наташа К. пришла в себя, ни подруг, ни гадалки рядом не оказалось. Как не оказалось в сумочке кошелька с деньгами, припасенными на подарки родным. Она кинулась разыскивать гадалку, но той и след простыл. И хотя Наташа помнит, как выглядела ее обидчица, доказать что-либо она не сможет, потому в милицию не обращалась.

По словам работников магазина "Мебель", что находится на рыночной площади, такие картины для них не редкость: часто цыганки останавливают их по пути на работу, зазывают, обещая погадать бесплатно. Но только ни разу не видели они, чтобы кто-то уходил после такого сеанса гадания довольным. ■

ОПРОС

НОЧЬ ПРОШЛА БУРНО И ВЕСЕЛО

Новогодние праздники окончены? У всех, но только не у нас! Ведь еще Рождество, а потом еще эта странная традиция — отмечать Новый год по старому стилю. Желание отметить праздник у нас в крови. Но одно дело — хотеть праздника, готовиться к нему, а совсем другое — этот праздник провести. Корреспонденты "ГС" вышли на улицы Слонима, чтобы спросить горожан: "Как вы встречали Новый 2004 год?"



Светлана ЮШКЕВИЧ, продавец салона сотовой связи:

— Мы в семье — домоседы. Так что Новый год я встретила дома с любимым мужем. Посидели за праздничным столом, а потом пошли гулять к центральной городской елке. Праздник, устроенный артистами, очень понравился: было много людей, веселая и увлекательная программа.

Николай МАЗУР, спортсмен:

— Новогодняя ночь у меня прошла бурно и весело. К центральной елке мы не выбрались, больно дорого было ехать в город на такси. Но зато мы собрались большой компанией друзей. И все вместе дружно веселились около елки, наряженной в нашем дворе. Конечно, ночь не обошлась без шампанского и рюмки водки, но от этого праздник удался еще лучше.



Дима и Инна, слонимчане:

— Новый год — это семейный праздник, поэтому мы никуда не пошли, а остались дома. Сначала, как обычно, под бой курантов мы поздравили друг друга с наступившим Новым годом, а потом уже вместе с друзьями ходили гулять. В этом году праздник удался на славу, и с погодой повезло — пушистый белый снежок очень был нужен. На удивление всем, он пошел за несколько часов до наступления Нового года. Оттого праздничного настроения прибавилось у всех.

Яна ИЛЬЮШЕНКОВА, учащаяся СШ №9:

— Новогоднюю ночь мы провели просто отлично. Ходили под елку. На удивление всем моим друзьям, там почти не было пьяных людей, все слонимчане веселились от души, поздравляли друг друга с праздником, желали всего самого лучшего. Очень понравился всем салют, совсем как по телевизору. И концерт был отличный, только артистов было немного жаль: все отдыхают, а они работают в новогоднюю ночь.



Антонина РЕДЬКИНА, предприниматель:

— Праздник встретили обалденно! По-домашнему посидели с мужем за столом, выпили шампанского, потом пошли на елку, которую поставили в нашем микрорайоне на Ершова. Какой-то особенной программы мы там не увидели, но наш народ и сам умеет неплохо веселиться: водили хороводы, пели песни, пускали фейерверки! Еще в новогоднюю ночь звонили дочери с зятем и внуками. Они у нас живут во Франции, в Ницце. Дети рассказывали, что на Новый год отправились в Диснейленд. Мы порадовались за них, хорошо, что они живут в свободной Европе, там столько возможностей для детей и внуков!

Тадеуш КУЧИНСКИЙ, слонимчанин:

— Так, как Новый год встречали в нашей семье, наверное, больше никто и не встречал! Почему? Да потому, что мы встречали его целых четыре раза! Сначала мы подняли бокалы с шампанским в 8 часов за наступивший Новый год в Казахстане, мы приехали в Слоним оттуда, там осталось много наших друзей. Потом в 11 часов мы выпили за наступивший праздник в России — это традиция, оставшаяся еще с советских времен. Для нас бой курантов — начало Нового года. Потом в 12 часов встретили наш, белорусский праздник. Ну, а в час ночи мы встречали Новый год по времени Польши и Германии, потому что за большим семейным праздничным столом в нашем доме, кроме двух сыновей, двух невесток и нас, родителей, был еще и гость из Германии. А потом, когда встретили все четыре Новых года, пошли веселиться под елку! Второго января мы всей семьей решили отправиться в Беловежскую пущу, в резиденцию белорусского Деда Мороза, но доехали на машине только до Мижевич: начался сильнейший буран и зимняя погода помешала нам. Пришлось вернуться домой...

Янина МЕЛЬНИКОВА

ЭЗ

НАВАГОДНІЯ ВАКАЦЫІ

■ Мікола КАНАНОВІЧ

Навагоднія вакацыі сёлета надарыліся не толькі ў школьнікаў. "Народ павінен адпачыць", — вырашыў прэзідэнт краіны і сваім указам увесь першы тыдзень 2004 года аб'явіў выхадным.

Але ў Слоніме далёка не ўсім прыйшлося так доўга святкаваць. Ужо ў навагоднюю ноч ва ўзмоцненым рэжыме працавалі міліцыя, МНС, брыгады хуткай медыцынскай дапамогі і аварыйныя камунальныя службы. Вялікі снегапад дадаў з пачатку года працы дарожнікам. Акрамя транспартных, спецыяльных і аварыйных службаў, не закрануў прэзідэнцкі ўказ некаторых катэгорый культработнікаў, даярак і даглядчыкаў жывёлы ў сельгаспрадпрыемствах, а таксама механізатараў, якія забяспечваюць працу жывёлагадоўчых ферма ў. На вёсцы ўвогуле своеасаблівы штодзённы графік працы круглы год.

Але і не ва ўсіх гарадскіх прадпрыемствах і ўстановах захацелі гуляць цэлы тыдзень. Так, 4, 5 і 6 студзеня аб'явілі рабочымі днямі на Слонімскім ільнозаводзе, 5 і 6 студзеня працаваў мясцовы вінзавод, друкарня, і нават (што здаецца некаліькі дзіўным падчас дзіцячых канікулаў) у панядзелак, 5 студзеня, выйшлі на працу педагогі некаторых гарадскіх школ. Супрацоўнікі рэдакцыі нашай газеты таксама доўга дома не заседжваліся і ўжо з нядзелі працавалі над чарговым нумарам.

Працаўнікі ж тых прадпрыемстваў і ўстаноў, якія спраўна скарысталіся ўказам прэзідэнта і выйдуць на працу толькі 8 студзеня, павінны будуць адпрацаваць некалькі наступных субот аў. Але гэта ўжо не так страшна пасля тыднёвай навагодняй гульбы, калі многія наноў пераканаліся, што няма больш цяжкай працы, як з дня ў дзень адпачываць. Вучоныя, дарэчы, даўно падлічылі, што багатыя на яду і пітво святочныя сталы вымагаюць здароўя не менш, чым цяжкая праца за заводскім станком. А калі яшчэ ні ў чым не ведаць меры, то, бывае, без дапамогі дактароў чалавеку наогул складана выйсці з эйфарычнага святочнага стану.

Так атрымліваецца, што святкаванне Новага года ў нас плаўна перацякае ў калядныя святкі. Па праваслаўным календары Нараджэнне Хрыстова прыпадае на 7 студзеня, а заканчваюцца калядныя святкаванні 14 студзеня. Гэта ж колькі здароўя і грошай трэба мець, каб з традыцыйным славянскім размахам адзначыць усе гэтыя святы!

Нягледзячы на ўсе захады сённяшняга кіраўніцтва прывучыць народ да здаровага ладу жыцця, адпачываюць па-новаму (на лыжах, на каньках, у спартыўных залах і палацах спорту) у нас нямногія, тым больш — у правінцыйнай глыбінцы. А вось працаваць па-новаму, падобна, пакрыху нас ужо прывучаюць. І арыфметыка тут простая: нават за прэзідэнцкія тыднёвыя навагоднія вакацыі табе ніхто не заплаціць. Таму, калі ёсць праца, адпачываць цэлы тыдзень — сабе даражэй. Святаў жа ў 2004 годзе, як і ў гады мінулыя, нас чакае нямала. Каб жа яшчэ ў дастатковай колькасці сродкаў, здароўя і крыху болей умення адпачываць. ■

ФОТОФАКТ



■ В ожидании автобуса. Слоним, 06.01.04 г.

НАША ЭКОНОМИКА

ЛЬНОЗАВОДЫ ПОПАЛИ ПОД УСИЛЕННОЕ ВНИМАНИЕ

Следствие выяснило, что Дворецкий льнозавод (Дятловский р-н) меняет свою продукцию на ядохимикаты, а Слонимский льнозавод заключил договор с Мозырским мебельным объединением на поставки ему льноватина взамен на мебель.

Добавив к списку еще несколько аналогичных предприятий, Гродненская областная прокуратура выставила представление заместителю Комитета по сельскому хозяйству области Николаю Похолку.

Льноперерабатывающие предприятия не от хорошей жизни вступают в бартерные сделки, как утверждают руководители, у них нет другого выхода. Потребители их продукции — белорусские предприятия, которые тоже не располагают внушительными оборотными средствами.

Как пояснил корреспонденту BelarusFee.org директор Слонимского льнозавода Николай Зезюлин, на их льноватин теперь нет сбыта. В России он неконкурентен по цене, а традиционный потребитель — фабрика «Прогресс» Гомельской области не имеет денег, чтобы рассчитываться. При этом власти постоянно требуют выполнения прогнозных показателей. Вот и приходится применять цепочки бартерных операций.

Нет денег и у большинства колхозов. Директор Дворецкого льнозавода Валерий Гринашкевич утверждает, что вынужден поставлять им ядохимикаты в обмен на собранный лен, потому что у них все равно не будет денег расплатиться за пестициды, а без них нечего ждать качественной продукции.

ГроднаOnline

НАША РЭЧАІСНАСЦЬ

ВЫЦВЯРЭЗНІК НОВЫ, АЛЕ ПА СТАРЫМ АДРАСЕ

■ Алена СІНЕВІЧ

З першага студзеня, пасля гадавога перапынку, у Гродне аднаўляе працу медвыцвярэзнік. Ён будзе працаваць па старым адрасе на вуліцы Сыракомлі.

Акрамя абласнога цэнтра, медвыцвярэзнікі адкрыюць у Лідзе і Слоніме. Ноч у выцвярэзніку для гродзенцаў будзе каштаваць дзве мінімальныя заработныя платы, што складае 33 тысячы рублёў. Выпівохам з Ліды і Слоніма прыйдзецца выкласці з кішэні па паўтары мінімалкі. Агульны штат міліцэйскіх і медыцынскіх работнікаў трох выцвярэзнікаў складаецца амаль з 60-ці чалавек.

Адзіны ў Гродне выцвярэзнік закрылі год таму па прычыне сваёй "стратнасці". У якасці падставы для закрыцця называлася таксама тое, што займацца п'янымі не з'яўляецца абавязкам органаў унутраных спраў. У сувязі з гэтым "лячэнне" перабраўшых лішку ўсклалі на бальніцу "хуткай дапамогі". За дзень у спецыяльную палату з гродзенскіх вуліц рэгулярна дастаўлялі па 3–5 чалавек.

Знаходжанне ў бальніцы на курсе выцвярэжвання было бясплатным для аматараў "зялёнага змія".

Вяртанне да "добра забытага старога" звязана з тым, што, з пункту гледжання міліцыі, медыкі не справіліся з ускладзенай на іх задачай па "рабоце" з п'яным кантынгентам. ■

НАША ПОШТА

ЯК МЯНЕ АДОРВАЛІ КАПУСТАЮ І МЫЛАМ

■ Іван ЦІМАФЕЙЧЫК

Доўгі час, нават калі я выйшаў на пенсію, у Зэльвенскім райвыканкаме мяне лічаць маладым і ніяк не інвалідам. Адзін начальнік, да таго ж не малога рангу, неяк па тэлефоне сказаў: "Ты скажы, колькі заплаціў за інваліднасць?" І хуценька трубку паклаў — мусіць, ад таго, што кошт інваліднасці ведае.

І вось аднойчы мне патэлефанавалі з райсабеса — прапанавалі ўзяць тры–чатыры галоўкі капусты. У мяне ж не было бульбы, і я папрасіў іх даць мне на такую ж вагу бульбы. Не здагадаўся, што такім падарункам на Дзень састарэлых мяне хацелі капустай амаладзіць!

У хуткім часе надышоў і Дзень інвалідаў. Зноў тэлефанаванне, што падарунак падрыхтавалі, і не кажуць які — знікне цікавасць. Прыязджаю. Работнік райсабеса (упраўлення па працы і сацыяльнай абароне) прыносіць мне пакуначак, з якога "выглядае" кавалак мыла гаспадарчага, кавалак мыла туалетнага, цюбік (накшталт зубной пасты), мабыць, пральны парашок, шалік і яшчэ штосьці. Дайце, кажу, лепей грашыма, бо няма за што хлеба купіць. Не далі, а пакуначак панеслі кудысьці...

Так я і застаўся ні з чым — ні грошай, ні мыла. Расказаў мужчынам, як мяне адорвалі. Тыя толькі ўпікнулі, што не ўзяў: не вяроўка ж, а дабро — капуста, мыла, шалік. Ды і равеў бы ў грошы, сеўшы на прыступках райвыканкама. Можа, і начальства прыцанілася б...

Падумаў я і разгубіўся: чаму было не ўзяць?.. Прадаў бы капусту, мыла і шалік — можа, і халадзільнік свой адрамантаваў бы, які з 1995 года не працуе, ці пабудаваў бы хлеўчык, каб можна было трымаць нейкую жывёлу.

Эх, дажыць бы да Дзён састарэлых ды інвалідаў. Цяпер я свайго шанцу не ўпушчу! ■

НОВОСТИ

ОСУЖДЕН ЗА ВАНДАЛИЗМ НА КЛАДБИЩЕ

ЛИДА. За вандализм на кладбище житель Лиды Дмитрий Бранковский решением суда приговорен к четырем с половиной годам лишения свободы с отбыванием наказания в исправительной колонии строгого режима. При этом учтено то обстоятельство, что осужденный совершил преступление, не успев отбыть предыдущую судимость.

Будучи пьяным, Бранковский без всяких причин повредил на городском кладбище более десятка памятников и надгробий. Не сумели остановить хулигана и молодые люди, с которыми он приходил на кладбище, чтобы... помянуть своего деда, ветерана Великой Отечественной войны.

"Приняв на грудь", внук устроил настоящий погром, чем причинил многим горожанам не только материальный, но и моральный ущерб. Все это учел суд, вынося хулигану приговор.

БЕЛТА

КОНІ ЗНАЙШЛІСЯ Ў СУСЕДЗЯЎ

МАСТЫ. Болей за месяц таму ў сельгаспрадпрыемстве "Мілявічы" з фермы збеглі пяцёра коней. Доўгія пошукі не далі належных вынікаў.

Толькі зусім выпадкова іх адшукалі на ферме ў вёсцы Крывічы суседняга Зэльвенскага раёна.

Прадстаўнікам прадпрыемства "Мілявічы" давялося нават звярнуцца да мясцовага ўчастковага, каб вярнуць сваю жывёлу.

АДКРЫЦЦЁ ПРЫТУЛКА ПЕРАНОСІЦЦА

МАСТЫ. Першага студзеня 2004 года планавалася адкрыццё дзіцячага сацыяльнага прытулка ў вёсцы Масты Правыя на базе дзіцячага садка.

Там павінны былі знаходзіцца на выхаванні дзеці, якія засталіся без бацькоўскай апекі. Аднак месцазнаходжанне інтэрната пакуль застаецца пад пытаннем, бо будынак, які выбралі, не адпавядае пэўным нормам.

СІРОТАЎ ПАЗБАЎЛЯЮЦЬ ЖЫЛЛЯ

МАСТЫ. Згодна з заканадаўствам, дзеці, якія пазбаўлены бацькоўскай апекі, сярод іншага, маюць права на захаванне за сабою жыллёвай плошчы.

Зараз у Мастоўскім раёне налічваецца 61-но дзіця-сірата, а 11 з іх не маюць жылля.

РАЗЛІЧЫЛАСЯ ПА-СВОЙМУ

МАСТЫ. Напярэдадні Новага года мастаўчанка Ц. забіла сваю старую маці. Пасля гэтага жанчына парэзала сабе вены і памерла.

ПАКВАПІЛАСЯ НА ГІРЛЯНДУ

МАСТЫ. Днямі міліцыя затрымала 16-гадовую мастаўчанку, якая спрабавала зняць гірлянду з галоўнай ёлкі горада, размешчанай ля стадыёна "Нёман".

Да такіх дзеянняў грамадзян камунальшчыкі і міліцыя, навучаныя вопытам мінулых гадоў, добра падрыхтаваліся: першыя тут дзяжураць з ранку да вечара, другія — ноччу.

СНЕГ НАРАБІЎ БЯДЫ

МАСТЫ. Снег, які выпаў за некалькі гадзін да пачатку Новага года, прынёс аўтамабілістам клопат. За гэты час у Мастоўскім раёне адбылося чатыры дарожна-транспартныя здарэнні, у выніку якіх адна жанчына загінула на месцы, а праз дзень ахвяра аварыі — мужчына — памёр у бальніцы.

САВЕТ РАСПРАДАЕ ТЭХНІКУ

МАСТЫ. Сесія Мастоўскага райсавета сваім рашэннем дала дазвол сельгаспрадпрыемству "Мастаўчанка" на продаж трактара МТЗ жыхару Зэльвенскага раёна.

Тэхніку 1990 года выпуску дэпутаты ацанілі ў памеры два мільёны трыста тысяч рублёў, што адпавядае па курсе тысячы долараў.

Язэп ПАЛУБЯТКА

ГАРЭЎ АЎТАМАБІЛЬ

ЗЭЛЬВА. Нядаўна ў жыхара в. Задвор'е загарэўся уласны мікрааўтобус.

У выніку загарання пашкоджанай аказалася пярэдняя частка аўтамабіля. Прычыны загарання высвятляюцца.

ГОСЦЬ ПУСЦІЎ "ЧЫРВОНАГА ПЕЎНЯ"

ЗЭЛЬВА. На каталіцкія Каляды ў СВК "Новае жыццё-АГРА" загарэліся дзве сцірты саломы. Агонь знішчыў 30 тон саломы, а 25 тон удалося выратаваць.

Як высветлілася, падпальшчыкам аказаўся псіхічнахворы жыхар г. Мінска, які прыехаў у Зэльвенскі раён у госці да маці.

ПАЖАР У НАВАГОДНЮЮ НОЧ

ЗЭЛЬВА. У хаце жыхара в. Чырвонае Сяло ноччу 1 студзеня здарыўся пажар. 55-гадовы гаспадар хаты задыхнуўся дымам і памёр.

Спецыялісты лічаць, што прычынай загарання стала курэнне ў стане алкагольнага ап'янення.

НОВЫ ГОД ПАЧАЎСЯ З КРАДЗЯЖУ

ЗЭЛЬВА. У першыя дні новага года ў в. Аляксандраўшчына Зэльвенскага раёна невядомыя абрабавалі краму.

Зладзеі пакваліліся ў асноўным на прадукты харчавання. Вядзецца праверка.

Наталля ГЛУШЭНЯ

ЗА РУБЕЖОМ

СОКРУШИТЕЛЬНАЯ ПОБЕДА ДЕМОКРАТИИ

ГРУЗИЯ. По предварительным данным ЦИК Грузии из 30 избирательных участков, обнародованным в понедельник, единый кандидат в президенты Грузии от правящих блоков "Национальное движение" и "Бурджанадзе-демократы" 36-летний Михаил Саакашвили получил около 95% голосов избирателей на прошедших 4 января выборах главы государства.

"Интерфакс"

ЕВРОПАРЛАМЕНТ БОМБЯТ ПО ПОЧТЕ

БЕЛЬГИЯ. В понедельник в здании Европарламента в Брюсселе взорвалась бомба, присланная по почте депутату Хансу-Герту Петтерингу, лидеру фракции Европейской народной партии. Как сообщает британская телерадиокомпания BBC, взрыв произошел, когда секретарь депутата открыла почтовое отправление.

Представитель Европейской народной партии сообщил, что в результате взрыва вспыхнуло пламя и был слышен громкий хлопок, однако пострадавших не было. В здании Европарламента, персонал которого вернулся к работе после рождественских каникул, были обнаружены еще три неразорвавшихся взрывных устройства, поступивших по почте.

Росбалт

150 МЛН. ФУНТОВ ЗА КОМАНДУ ФОРМУЛЫ-1

АНГЛИЯ. Британские газеты сообщили, что российский миллиардер Роман Абрамович ведет тайные переговоры с Эдди Джорданом о покупке его команды Формулы-1.

Об этом сообщает информационное агентство Reuters. Представитель Джордана дала уклончивые комментарии и сказала, что Джордан и Абрамович встречались в прошлом году только на Гран-при в Нюрнберге в июне и на футбольном матче. Между тем британская пресса пишет, что Абрамович за последний месяц уже четыре раза встречался с Джорданом и предложил за его команду 150 млн. фунтов стерлингов.

Росбалт

ПОЛИЦЕЙСКИЙ СПАС КОНТРАБАНДИСТА

ПОЛЬША. Польский полицейский в городе Пшемысль спас украинского контрабандиста, рискуя собственной жизнью.

Об этом сообщил пресс-секретарь полиции Подкарпатского воеводства Веслав Дыбась. По его словам, в понедельник утром патруль полиции попытался задержать мужчину с двумя большими сумками. Мужчина попытался убежать по льду реки, но провалился под лед. Тогда полицейские вызвали подмогу, а также "скорую" и пожарников. При помощи веревки один из патрульных бросился в воду и вытащил тонущего. Правонарушителем оказался 64-летний гражданин Украины.

Росбалт



▪ Президент на зимней лыжне

ЛУКАШЕНКО ВСТРЕТИЛ НОВЫЙ ГОД ТРЕЗВЫМ

Пресс-секретарь президента Беларуси Наталья Петкевич рассказала о том, что в новогоднюю ночь Александр Лукашенко не пьет даже шампанского.

Отказавшись от спиртных напитков, белорусский лидер следит за ситуацией в стране, отметила Петкевич. По традиции, первый день 2004 года Александр Лукашенко посвятил занятиям спорта.

Сам Лукашенко неоднократно подчеркивал, что праздник он относит к числу своих самых любимых, – передает РИА Новости.

– Это и мой самый любимый праздник, и мы любим его за то, что он обязательно должен принести что-то новое. Мечтая, в эти дни мы ждем сказку и хотим, чтобы она исполнилась, – сказал глава Беларуси.

Президент Молдовы Владимир Воронин встретил Новый год в кругу семьи. Новогоднюю ночь глава государства со своими близкими провел в официальной резиденции, расположенной неподалеку от Кишинева в лесном массиве Кодры. А украинский президент встречал Новый год в Баден-Бадене, куда отбыл для прохождения реабилитационного курса после перенесенной недавно операции.

ХАРТИЯ-97

СМИ В БЕЛАРУСИ

ЗАГЛУШИЛИ ПУГАЧЕВУ С КИРКОРОВЫМ

Качество ретрансляции программ телеканала «Россия» в наступившем году на территории Белоруссии заметно ухудшилось.

Как сообщили в Белорусской ассоциации журналистов, это вызвано организационным нововведением властей Белоруссии.

С 1 января Национальная государственная телерадиокомпания Белоруссии прекратила на территории страны ретрансляцию программ «России».

